мінах азнаямляльную практыку ў канцы III курса. Неабходна змяніць тэрміны практыкі ў бок павелічэння, асабліва на V, апошнім курсе Беларускага універсітэта культуры. Гэта дасць магчымасць больш грунтоўна авалодаць практычнымі навыкамі работы ў аўтаматызаваным рэжыме, сканцэнтравацца на навукова-даследчай і навукова-арганізацыйнай дзейнасці будучых спецыялістаў і іх самаадукацыі, бо менавіта гэтага вопыту і ўменняў не хапае на практыцы маладым спецыялістам.

У апошнія гады побач з выкарыстаннем у якасці баз практыкі буйнейшых бібліятэк рэспублікі назіраецца размеркаванне студэнтаў па небібліятэчных установах г. Мінска, нават камерцыйных, што, на наш погляд, не спрыяе прыходу кваліфікаваных кадраў у публічныя бібліятэкі рэспублікі. У сувязі з гэтым было б пажадана больш актыўна выкарыстоўваць абласныя універсальныя бібліятэкі як навукова-метадычныя цэнтры сваіх рэгіёнаў у якасці баз практыкі. Асабліва мэтазгодным гэта бачыцца для такіх спецыялізацый, як "менеджмент і маркетынг бібліятэчнай справы" і "аўтаматызаваныя бібліятэчна-інфармацыйныя сістэмы".

На думку практыкаў, вышэйназваныя прапановы будуць спрыяць не толькі больш якаснай падрыхтоўцы спецыялістаў, але і вырашэнню праблемы забеспячэння ўстаноў культуры прафесійна падрыхтаванымі кадрамі.

**Н.У.Клімянкова,**
**дацэнт Беларускага універсітэта культуры**

## ФАРМІРАВАННЕ КАМУНІКАТЫЎНАЙ КАМПЕТЭНТНАСЦІ СТУДЭНТАЎ ПАДЧАС ВЫТВОРЧАЙ ПРАКТЫКІ Ў БІБЛІЯТЭЦЫ

Увага даследчыкаў падчас вытворчай практыкі ў асноўным засяроджваецца на метадычных і арганізацыйных пы-

таннях, на фарміраванні ў студэнтаў прафесійных навыкаў і ўменняў.

Разам з тым вытворчая практыка — гэта не толькі выпрабавальны палігон для станаўлення бібліятэкара-прафесіянала, але яшчэ ў большай ступені праверка асобасных якасцей студэнта, яго ўменння працаваць у камандзе, наладжваць кантакты з людзьмі, навыкаў самапрэзентацыі, міжасобаснага і дзелавога ўзаемадзеяння.

Яшчэ не было такога выпадку, каб эфектыўныя зносіны і асабістая прывабнасць станоўча не ўплывалі на адзнаку дзейнасці студэнта-практыканта. Але ёсць мноства прыкладаў, калі несфарміраванасць культуры зносін, памылковыя паводзіны ў адносінах да калег і кіраўнікоў практыкі прыводзілі да зніжэння адзнакі і нават да адлічэння студэнта з вышэйшай навучальнай установы.

Камунікатыўная кампетэнтнасць — гэта і ўменне адэкватна ўспрымаць, разумець партнёра па зносінах, і здольнасць данесці да яго неабходную інфармацыю, найлепшым чынам "падаць сябе", забяспечыць станоўчы фон узаемадзеяння, словам, навука і мастацтва наладжвання эфектыўных стасункаў пры любых абставінах, з любымі партнёрамі, асабліва на рабоце.

Фарміраванне кампетэнтнасці ў любой сферы, у любым выглядзе дзейнасці ўключае наступныя кампаненты: веданне тэорыі, уменне ўжываць яе на практыцы, здольнасць правільна ацэньваць сваю дзейнасць і дзейнасць іншых людзей. Адносна зносін яна ўвасабляецца ў авалодванні тэорыяй, адлюстраванай у псіхолага-педагагічных навуках, уменні наладжваць і падтрымліваць кантакты з людзьмі, супрацоўнічаць і ўзаемадзейнічаць, здольнасці аналізаваць пэўныя сітуацыі і паводзіны, выбіраць аптымальныя варыянты ўзаемаадносін і стасункаў.

Практыцы ў дадзеным выпадку належыць вядучая роля. Як нельга навучыцца плаваць, не ўваходзячы ў ваду, так і камунікатыўную кампетэнтнасць не набыць без зносін, стасункаў, кантактаў з людзьмі. Аднак набыццё ведаў, уменняў і навыкаў метадам спроб і памылак малапрадуктыўна, бо



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

памылку выправіць часам няма калі, а вынікі ў выглядзе паніжанай адзнакі застаюцца назаўсёды. Выйсце мы бачым у аптымальным спалучэнні вывучэння тэарэтычных аспектаў зносін з набыццём практычных навыкаў, праверцы тэорыі практыкай.

Напрыклад, напярэдадні вытворчай практыкі студэнты IV курса спецыялізацыі "публічныя бібліятэкі" вывучаюць дысцыпліны спецыялізацый "бібліятэчныя зносіны" і "бібліятэрапія", а на V курсе — курс "Бібліятэчная канфлікталогія". Матэрыял пабудаваны такім чынам, каб дапамагчы студэнтам у набыцці камунікатыўных ведаў, уменняў і навыкаў, выпрацаваць алгарытмы рацыянальных паводзін у тыповых сітуацыях.

Так, веданне законаў і эфектаў успрымання дапамагае студэнту зразумець,чаму неаднолькава ставяцца да розных людзей, неадэкватна ацэньваюць іх паводзіны, ад чаго залежыць міжасобасная прывабнасць і як яе дасягнуць. Аналіз прыводзіць да высновы, што чатыры з шасці фактараў уласцівыя прафесійным паводзінам бібліятэкара: узаемадапаўняльнасць, агульнасць мэт, інтарэсаў, установак, дапамога ў дасягненні пэўнай мэты і наяўнасць дыстанцыі ў зносінах. Трэба толькі выконваць свае абавязкі і дадаць да гэтага трошкі знешняй прывабнасці і эмпатыі.

Законы і памылкі атрыбуцыі таксама паспяхова праходзяць апрабацыю вытворчай практыкай, таму што парушэнне законаў і памылкі выклікаюць многія канфліктныя сітуацыі. Асабліва прадуктыўна спалучэнне тэорыі з практыкай адбываецца пры выкладанні курса "Бібліятэчная канфліктагогія". Студэнты ўжо маюць вопыт праходжання вытворчай практыкі і могуць аналізаваць рэальныя канфліктныя сітуацыі, што станоўча адбіваецца на засваенні ведаў. Навыкі прадухілення і вырашэння канфліктаў замацоўваюцца потым падчас вытворчай практыкі ў наступным семестры, а адзнаку ставіць само жыццё і тая ж практыка.

На нашу думку, каб зрабіць фарміраванне камунікатыўнай кампетэнтнасці студэнтаў працэсам мэтанакіраваным і паслядоўным, трэба спецкурс "Бібліятэчныя зносіны" вык-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ладаць на ўсіх спецыялізацыях або распрацаваць і дадаць да праграмы практыкі "Метадычныя матэрыялы па павышэнні кампетэнтнасці ў зносінах", дзе змясціць агульныя парады, рэкамендацыі і мінімум тэарэтычных ведаў, неабходных і дастатковых для паспяховых зносін з чытачамі і бібліятэкарамі.

І.Н.Колабава,
ст. выкладчык Беларускага універсітэта культуры

## АРХЕАЛАГІЧНАЯ ПРАКТЫКА: ПРАБЛЕМЫ І СПОСАБЫ ІХ ВЫРАШЭННЯ

У адпаведнасці з вучэбным планам па курсе "Археалогія" на працягу трох апошніх гадоў на кафедры гісторыі і музеязнаўства са студэнтамі II курса спецыяльнасці "музеязнаўства і ахова помнікаў гісторыі і культуры" праводзіцца 2-тыднёвая вучэбная студэнцкая палявая археалагічная практыка. Яна ўваходзіць у агульны практычны курс, які ўключае азнаямляльную і камеральную часткі археалагічнай практыкі.

Базай практыкі з'яўляецца Інстытут гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук. Кіруе практыкай ад Інстытута гісторыі старшы навуковы супрацоўнік кандыдат гістарычных навук Ю.А. Заяц.

Археалагічная практыка праводзіцца на Менскім гарадзішчы ля в. Гарадзішча Шчомысліцкага с/с Мінскага раёна.

Менскае гарадзішча з'яўляецца комплексам археалагічных помнікаў, найбольш раннія з якіх адносяцца да культуры штрыхаванай керамікі. Менавіта тут першапачаткова знаходзіўся старажытны Менск, і студэнты-практыканты, такім чынам, упершыню непасрэдна дакранаюцца да старажытнай гісторыі Беларусі.

Удзел у земляных работах на помніку археалогіі дазваляе кожнаму студэнту выканаць галоўную задачу практыкі



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ